Источник: **«Народная газета» - 2012-09-13**

## *Нацыі і канфесіі – ў адной кнізе*

6 верасня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі «Кто живёт в Беларуси», выдадзенай «Беларускай навукай». Навукова-папулярнае выданне падрыхтавалі этнолагі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі сумесна з Апаратам Упаўнаважанага па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Яно шырока прадстаўлее сацыяльную, матэрыяльную і духоўную культуру народаў, якія жывуць на тэрыторыі нашай краіны.

Кніга складаецца з дзвюх частак. У першай сабраныя звесткі пра паходжанне, адметнасці рассялення, традыцыі і культуру этнічных меншасцяў. Другая распавядае пра канфесіі, што атрымалі найбольшы распаўсюд на беларускіх землях. Выданне багатае на ілюстрацыі: выкарыстаныя фотаздымкі з асабістых архіваў аўтараў, ілюстрацыі з фондаў музеяў і бібліятэк, а таксама картаграфічны матэрыял.

Да мерапрыемства падрыхтаваная выстаўка «Этнічная мазаіка Беларусі», дзе прадстаўлена больш за 150 дакументаў XVIII – XIX стст. (сярод іх – рукапісныя кнігі, створаныя на беларускіх землях.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***